А. М. Маладцова

# Беларуская мова

## КАНТРОЛЬ ВУЧЭБНЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

# 2

## клас

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай
і рускай мовамі навучання

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 0

# Прадмова

Прадстаўленыя ў дапаможніку кантрольныя дыктанты, слоўнікавыя дыктанты, кантрольныя работы і тэсты ахопліваюць усе тэмы праграмы па беларускай мове для 2 класа, таму іх колькасць больш той, якая вызначаецца Інструкцыяй аб парадку фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Педагог можа выкарыстоўваць для тэматычнага кантролю любую з прапанаваных работ, а астатнія выкарыстоўваць для прамежкавага, пазаняткавага кантролю альбо для дыягностыкі з мэтай пабудовы адпаведнай карэкцыйнай работы.

Аб'ёмы прапанаваных у дапаможніку відаў кантрольных работ адпавядаюць Метадычным рэкамендацыям па фарміраванні культуры вуснай і пісьмовай мовы ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Прапанаваныя аўтарам тэматычныя кантрольныя работы ўтрымліваюць 5 заданняў, якія ў поўнай меры ахопліваюць асноўны змест канкрэтнай вывучанай тэмы.

Заданні, уключаныя ў дадзены зборнік, мяркуюць праверку не толькі практычных уменняў навучэнцаў, але і ведаў навуковых тэарэтычных паняццяў. Прапанаваныя тэсты дапамогуць вызначыць, наколькі веды вучня адпавядаюць патрабаванням, што прад'яўляюцца вучэбнай праграмай.

Тэставыя заданні ў дадзеным зборніку размеркаваны па тэмах. Па кожнай тэме прадстаўлены тэсты двух варыянтаў аднаго ўзроўню складанасці.

Кантрольнымі пісьмовымі работамі ў 2 класе з'яўляюцца:

- кантрольнае спісванне;
- кантрольны дыктант;
- кантрольны слоўнікавы дыктант;
- кантрольная работа па тэме;
- тэматычны рознаўзроўневы тэст.

**Абавязковыя кантрольныя пісьмовыя работы:**

*I паўгоддзе:*
кантрольнае спісванне — 1 (20—25 слоў);
кантрольная работа па тэме — 1;
кантрольны слоўнікавы дыктант — 1 (5 слоў).

*II паўгоддзе:*
кантрольны дыктант — 1 (25—30 слоў);
кантрольная работа па тэме — 1;
кантрольны слоўнікавы дыктант — 1 (6 слоў).

# СЛОЎНІКАВЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Слоўнікавыя словы

Калідор, лесвіца, відэлец, кватэра, дождж, дзверы, талерка, рукзак, сусед, сцюжа, ёсць, Рэспубліка Беларусь, акварыум, герой, калектыў, месяц, метро, мяккі, памяць, стадыён, тэатр, цвёрды, чацвер, мядзведзь, медаль.

## Слоўнікавыя словы для кантрольных слоўнікавых дыктантаў

*I паўгоддзе*

5 слоў: вераб'і, кватэра, дождж, рукзак, ластаўка.

*II паўгоддзе*

6 слоў: дзяўчынка, сцюжа, талерка, відэлец, учора, цыбуля.

# ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭКСТЫ КАНТРОЛЬНАГА СПІСВАННЯ

## I паўгоддзе

* * *

Даўно ўжо пажаўцела трава. З дрэў апалі апошнія лісточкі. Толькі на азімых палях зелянее рунь. Снег пакрывае зялёнае поле. Неспакойна становіцца на душы. (23 словы)

Паводле К. Ушынскага

* * *

Казкі з'явіліся вельмі даўно. Людзі расказвалі іх адзін аднаму. Яны марылі аб лепшым жыцці. Высмейвалі скупых і лянівых. У казках заўсёды дабро перамагае зло. (24 словы)

* * *

Верасень — першы месяц восені. У верасні зацвітаюць верасы. Сады і лясы змяняюць сваю летнюю вопратку на асенняе ўбранне. Многія птушкі адлятаюць на поўдзень. (23 словы)

* * *

У кастрычніку павялічваецца колькасць пахмурных дзён. Але часам — сонечнае надвор'е. Плывуць у празрыстым паветры тонкія ніці павуцінак з маленькімі павучкамі. Бабіна лета. (22 словы)

* * *

Лістапад — самы пахмурны месяц у годзе. Неба амаль заўсёды зацягнута шэрымі хмарамі. Пад дажджамі і ветрам ападаюць з дрэў апошнія пацямнелыя лісты. (22 словы)

* * *

Алоўкі і ручку кладзі ў пенал. Сшыткі складвай у папку. Кнігі, папку і пенал кладзі ў ранец. Вучэбныя прылады — твае лепшыя сябры і памочнікі. (24 словы)

* * *

Першае верасня ў нашай краіне — Дзень ведаў. Які гэта хвалюючы і радасны дзень! У краіну ведаў адпраўляюцца школьнікі і студэнты. Смялей ідзіце па яе дарогах! (25 слоў)

## Ускраіна лесу

Важна стаяць векавыя дрэвы. Побач растуць калматыя маладыя сасонкі. Крыху далей бялеюць ствалы бяроз. На пагорку чырванеюць суніцы. (20 слоў)

## Добрая справа

Вясна прынесла цяпло. Дзеці вырашылі пасадзіць каля школы кветкі. Дружна ўзяліся яны за справу. Хутка на клумбах з'явіліся зялёныя ўсходы. (22 словы)

## Варыянт 2

1. Пранумаруйце ў алфавітным парадку словы, якія называюць прадмет.

   Над зямлёй крылае бусел.
   Скачуць конікі ў траве.
   Дзед жыве ў Беларусі... (А. Зэкаў)

2. Устаўце літары ***у*** або ***ў***. Падкрэсліце спалучэнні слоў з прыназоўнікам.

   Скач__ць __ траве, знайшла __ д__пле, __пала __ л__жын__, паклала __ шпако__ню.

3. Прачытайце. Устаўце апостраф або мяккі знак, калі патрэбна. Падзяліце выдзеленыя словы лініяй (|) на склады і дугой унізе — для пераносу.

   **Вераб__і**, мален__кі, сур__ёзны, **Мар__я**, пад__ехалі, біл__ярд, Аркадз__еўна, жніў__ё.

4. Падзяліце запіс лініяй (|) на словы сказа. Устаўце прапушчаныя літары.

   В__снавоесон__йкаадбіласяўпразрыстайлуж__не.

5. Прачытайце. Устаўце прапушчаныя літары або знакі. Падкрэсліце граматычную аснову. Дапішыце пары слоў, якія адпавядаюць пытанням.

   Ц__ц__рукі на в__ршалінах дрэў расселіся — да яснага надвор__я.

   А) (Што зрабілі?) ____________________ на вершалінах.

   Б) (Да якога?) Да ____________________ надвор’я.

# Змест

Прадмова . . . . 3

СЛОЎНІКАВЫЯ ДЫКТАНТЫ . . . . 4

ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭКСТЫ КАНТРОЛЬНАГА СПІСВАННЯ . . . . 5

ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭКСТЫ КАНТРОЛЬНАГА ДЫКТАНТА . . . . 8

ТЭМАТЫЧНЫ КАНТРОЛЬ . . . . 11

Уступны моўны курс . . . . 11
Тэст 1 . . . . 11
Тэст 2 . . . . 13
Тэст 3 . . . . 15
Тэст 4 . . . . 17
*Кантрольная работа па тэме «Уступны моўны курс»* . . . . 19
Гукі і літары . . . . 21
Націск . . . . 23
Галосныя і зычныя гукі . . . . 25
Алфавіт . . . . 27
Напісанне вялікай літары ў словах . . . . 29
Склад. Падзел слоў на склады. Правілы пераносу . . . . 31
*Кантрольная работа па тэме «Гукі і літары»* . . . . 33
Правапіс літар *о, э—а* . . . . 35
Правапіс літар *е, ё—я* . . . . 37
*Кантрольная работа па тэме «Гукі і літары. Правапіс слоў»* . . 39
*Кантрольная работа па тэме «Правапіс слоў»* . . . . 41
Правапіс парных цвёрдых і мяккіх зычных . . . . 43
Правапіс няпарных цвёрдых (зацвярдзелых) зычных . . . . 45
Правапіс слоў з парнымі звонкімі / глухімі зычнымі на канцы слоў і перад зычнымі . . . . 47
Правапіс падоўжаных зычных. Перанос слоў з імі . . . . 49
Раздзяляльныя знакі — апостраф і мяккі знак . . . . 51
*Кантрольная работа па тэме «Гукі і літары»* . . . . 53
Слова . . . . 55
Словы, якія называюць прадметы . . . . 57
Прыназоўнік . . . . 60
Словы, якія называюць прыметы прадметаў . . . . 62
Словы, якія называюць дзеянне прадметаў . . . . 65
Сказ . . . . 67
Тэкст . . . . 70
Паўтарэнне . . . . 73